**ДАПАЎНЕННЕ** – даданы член сказа, які абазначае аб'ект дзеяння, стану, прыметы, звязваецца з паяснёным словам з дапамогай кіравання.

У залежнасці ад паяснёнага (кіравальнага) слова дапаўненне бывае:

**прыдзеяслоўнае** – залежыць ад дзеяслова і можа быць ***прамым*** і ***ўскосным***:

***прамое дапаўненне*** абазначае прадмет, поўнасцю ахоплены дзеяннем, і выражаецца:

1) назоўнікам, займеннікам (іншымі часцінамі мовы пры ўмове іх субстантывацыі), колькасна-іменным спалучэннем у вінавальным склоне без прыназоўніка: *Вуліца перасякала праспект пад прамым вуглом…* (У. Рубанаў); *Мудры час усё расстаўляе па сваіх месцах…* (Г. Бураўкін); *Мінулае трэба ведаць…* (Я. Ермаловіч); *У глушэчы нясмела крычала першае "ку-ку" зязюля* (Б. Сачанка); *Скарына ведаў добры дзясятак моў, у тым ліку лацінскую і старажытнагрэчаскую…* (Н. Гілевіч); *Тры кругі зрабіла жыццёвая лодка паэта…* (У. Калеснік);
2) назоўнікам, займеннікам у форме роднага склону без прыназоўніка:
   а) пры дзеясловах з адмоўем *не*: *Кніг тады амаль не было…* (Н. Гілевіч); *Я не разумею задачы*;
   б) калі дапаўненне абазначае частку прадмета: *Васька выпіў малака, з'еў хлеба*;
   в) калі дапаўненне абазначае прадмет часовага карыстання: *Гаспадар, талковы і ветлівы дзядзька, ахвотна даў нам за сходную плату маторнай лодкі…* (Я. Брыль); – *Дзядзька, дайце плашча! Маліны мокнуць! Цэлы кошык малін* (Б. Сачанка) ;
   г) калі дапаўненне абазначае вялікую колькасць або меру чаго-небудзь: *Дзеці нанасілі вады*; *Хлопцы нарыхтавалі сушняку, распалілі вогнішча*;
   д) пры дзеясловах думкі, успрыняцця, жадання (*прасіць, чакаць, ведаць, разумець, чуць* і інш.): *Я прашу прабачэння; Мы жадаем вам шчасця*;
   е) пры дзеясловах *асцерагацца, баяцца, дабівацца, палохацца, патрабавацца, саромецца* і некаторых іншых: *Мы асцерагаемся навальніцы; Ён дабіўся поспеху;*

***ускоснае дапаўненне*** – абазначае прадмет, ахоплены дзеяннем ускосна, і выражаецца формамі ўскосных склонаў (акрамя вінавальнага, а таксама роднага пры пэўных умовах) назоўнікаў, займеннікаў, субстантываваных часцін мовы, спалучэннямі слоў і інфінітывам: *Аб пісьменніку чытачы мяркуюць па яго творы* (В. Вітка); *Маё дзяцінства адкрыла для сябе і назаўсёды запомніла сваю вёску* (Я. Сіпакоў); *З гэтага ўсё пачалося* (А. Варановіч); *Паэт умее прымусіць чытача паўней адчуць і глыбей ацаніць свабоду, заваяваную ў агні баёў…* (У. Калеснік);

**прыйменнае** – залежыць ад назоўніка або прыметніка і адпаведна можа быць двух тыпаў:

1) ***прысубстантыўнае дапаўненне*** – залежыць ад аддзеяслоўнага, суадноснага з дзеясловам, адпрыметнікавага назоўніка і выражаецца назоўнікам і займеннікам ускосных склонаў з прыназоўнікамі і без іх: *Гераічнае і трагедыйнае змаганне за права быць маладым, ісці ў будучыню, знішчаць і тварыць – скразная тэма і страсць паэзіі Танка на першых двух кругах* (У.Калеснік); *Самай адметнай ягонай* [*К.Чорнага*] *рысай у творчасці і жыцці была шчодрасць. Шчодрасць на мастацкую самааддачу, шчодрасць на ўражанні…* (М.Стральцоў); *Ужо само разуменне ролі кнігадрукавання ў развіцці чалавечай цывілізацыі гаворыць пра многае* (Н.Гілевіч); *Паглыбленае*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*асэнсаванне подзвігу звязана ў творах паэта з духоўным узбагачэннем героя* (У.Калеснік);

2) ***прыад'ектыўнае дапаўненне*** залежыць ад якаснага або адноснага прыметніка, які, як правіла, з'яўляецца іменнай часткай выказніка: *Вада ў гэтых азёрах чыстая, празрыстая, багатая на кісларод* (В.Вольскі); *Лес шчодры грыбамі, ягадамі, арэхамі;*

**прыадвербіяльнае** -- залежыць ад прыслоўяў (акалічнасцей двухсастаўнага сказа) і безасабова-прэдыкатыўных слоў (выказнікаў аднасастаўнага сказа): *Блізка ад дарогі на сасне мільганула нешта жывое, рудабокае* (Т. Хадкевіч); *Недалёка ад хаты знаходзіўся пограб; ...Яму* [*дзядзьку*] *радасна ад марознасці, свежасці...* (А. Жук); *Твару надзвычай горача.*

Паводле структуры дапаўненні могуць быць:

**простыя** (выражаны адной словаформай): *У песні чалавек найбольш поўна і глыбока выяўляе сваю душу* (У. Краўчанка). *Яшчэ з вясны пра паэта загаварылі газеты і часопісы* (А. Бачыла);

**складаныя** (выражаны спалучэннямі і словазлучэннямі розных часцін мовы): *Кожнаму з нас лёс адводзіць свой зямны куток...* (Г. Бураўкін); *Снегавых шапак гор не відаць...* (Я. Брыль); *А Купала падносіць мне два* яшчэ *зусім новенькіх... экзэмпляры "Паўлінкі"* (П. Мядзёлка)

(Дапаўненне можа выражацца *сказамі*: *Сваё спрадвечнае "выганяй!" пракрычаў пастух.* (Б.Сачанка)).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ